УСТАНОВА АДУКАЦЫІ

“БІП – Інстытут правазнаўства”

ПОЛЯК Н.А. Канфесійная сітуацыя на землях Беларусі ў канцы XVII – пачатку XVIII стст. на прыкладзе праваслаўных і пратэстантаў: прававы аспект. // Зборнік матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі прысвечанай 75-ці годдзю доктара юрыдычных навук, прафесара Сокала Сцяпана Фёдаравіча  24-25.11.2017 г. Мінск-Гродна БІП – 2018 – 201 с. – С. 133-144

Мінск БІП 2018

# КАНФЕСІЙНАЯ СІТУАЦЫЯ НА ЗЕМЛЯХ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVII – ПАЧАТКУ XVIII СТСТ. НА ПРЫКЛАДЗЕ ПРАВАСЛАЎНЫХ І ПРАТЭСТАНТАЎ: ПРАВАВЫ АСПЕКТ.

*Поляк Н.А. (ВА РБ)*

Дзяржаўная канфесійная палітыка ўрада Рэчы Паспалітай разам з войнамі сярэдзіны XVII ст. і перамогай контррэфармацыі прывялі да фарміравання на тэрыторыях, якія сёння аб'яднаны межамі Рэспублікі Беларусь, у канцы XVII – пачатку XVIII стст. супярэчлівай і дастаткова арыгінальнай канфесійнай сітуацыі. Сутнасць якой заключалася ў змене прававога становішча праваслаўных і пратэстантаў не на карысць апошніх.

Дадзеная праблема з'яўляецца значнай і актульнай для гістарычнай навукі і яе распрацоўка дапаможа вызначыць асаблівасці канфесійных адносін. А так сама адказаць на хвалючыя пытанні аб правым і сацыяльным статусе канфесій на землях Беларусі ў параўнані з аднавернымі астатніх рэгіёнаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

Вывучэннем прававога становішча розных хрысціянскіх канфесій у Рэчы Паспалітай займаліся шмат якія гісторыкі Польшчы, Расіі, Украіны, Літвы і Беларусі, але, як правіла, без уліка спецыфікі царкоўных адносін усходніх тэрыторый ВКЛ. У ІІ палове XVII ст. –пачатку XVIII ст. тут былі прадстаўлены праваслаўныя, каталікі, уніяты, пратсэтанты, мусульмане і іўдзеі. Сваю ўвагу мы засяродзім на прававым становішча праваслаўных і пратэстантаў.Пратэстанцкае насельніцтва зямель сучаснай Беларусі было прадстаўлена кальвіністамі і, у меншай ступені, лютэранамі. Кальвіністы (рэфармаваныя евангелікі) Рэчы Паспалітай уваходзілі ў склад Вялікапольскай, Малапольскай і Літоўскай абшчын (правінцый). Беларускія кальвіністы колькасна пераважалі ў Літоўскай евангеліцка-рэфармаванай правінцыі, якая ў XVIII ст. лічылася дастаткова моцнай, буйной і трывалай. Літоўская правінцыя падзялялася на 6 дыстрыктаў (акруг), чатыры з якіх (Віленскі, Беларускі (Рускі), Навагрудскі і Берасцейскі (Падляшскі) прыходзіліся на сучасныя беларускія землі. Віленская акруга аб'яднала абшчыны Вільні, Трокаў, Ашмян, Ліды, Браслава і іншых гарадоў і мястэчак Беларусі і часткова Літвы. У склад Навагрудскага дыстрыкта ўваходзілі абшчыны Навагрудка, Ваўкавыска, Мазыра, Рэчыцы і іншых прылягаючых да іх населеных пунктаў, у Беларускі (Рускі) дыстрыкт – абшчыны Мінска, Койданава, Полацка, Мсціслава, Оршы і інш. Берасцейскі (Падляшскі) дыстрыкт складаўся з пратэстанцкіх абшчын Брэста, Пінска, Гродна, Слоніма і іх ваколіц, Завілейскі – з абшчын Вілкаміра, Коўна, Упіты і інш., Жмудскі – з абшчын Кейдан, Шыдлава і інш. [1, с. 359]. Буйнейшымі рэлігійнымі і культурна-асветнымі цэнтрамі беларуска-літоўскага кальвінізму былі Вільня і Кейданы (на тэрыторыі сучаснай Літвы), Крулявец (у суседняй Прусіі, цяпер – на тэрыторыі Расіі), Койданава і Слуцк (у межах сучаснай Беларусі) [2, с. 230].

Ваенныя ліхалецці XVII ст. негатыўна адбілася на сацыяльна-прававым стане пратэстантызму на беларускіх землях і моцна падарвалі

матэрыяльна-эканамічную базу яго прыхільнікаў. Паводле падлікаў польскага даследчыка Т. Войяка, ваенныя падзеі сярэдзіны XVII ст. зменшылі колькасць пратэстанцкіх збораў у Польскім каралеўстве амаль у тры разы. У Княстве іх стала менш напалову [3, с. 141]. Былі спустошаны і занядбаны кальвіністкія зборы ў Віцебску, Полацку, Мінску, Слуцку і іншых гарадах. Візітацыя ў 1667 г. кальвінісцкіх збораў Беларускага дыстрыкта яго кіраўніком Крыштафам Жарнаўцом паказала, што не мае добрага будынку збор у Мінску, на мяжы закрыцця кальвінісцкая школа ў Койданаве і мясцовая пратэстанцкая шляхта вымушана аддаваць сваіх дзяцей вучыцца да езуітаў у Мінск. [4, с. 200].

Змяншэнне колькасці пратэстантаў на беларускіх землях паскорана працягвалася да канца XVIII ст. Разам з тым, як адзначае аўтарытэтны даследчык беларуска-літоўскага пратэстантызму М. Косман, евангелікі ВКЛ колькасна пераважалі над аднаверцамі Кароны і знаходзіліся ў значна лепшых умовах. Таму што, антыпратэстанцкія соймавыя пастановы, якія агаворвалі грамадзянскі статус евангелікоў, на ВКЛ часам не распаўсюджваліся або рэалізоўваліся тут дастаткова своеасабліва. Так, у вырашэнні пытанняў аб вяртанні пратэстантам іх збораў у ВКЛ улічваліся такія аргументы, якія ніколі не маглі быць узяты пад увагу ў Кароне [5, с. 34].

Да згасання рэфармацыйнага руху на беларускіх землях вяло і узмацненне жорсткасці ў другой палове XVII ст. курсу дзяржаўнай рэлігійнай палітыкі Рэчы Паспалітай на скасаванне верацярпімасці. Соймавыя канстытуцыі 1658 г. і 1668 г. абвяшчалі каталіцкае веравызнанне дзяржаўным у Рэчы Паспалітай. Забараняўся пераход з каталіцызму ў іншыя канфесіі, некатолікам нельга было займаць урадавыя пасады. Сойм 1673 г. зачыніў дысідэнтам дарогу ў шляхецтва. Аднак адрозненні ВКЛ ад Кароны ў палітычным, парламентарным, культурным і рэлігійным планах [6, с. 347] абумовілі на яго тэрыторыі больш спрыяльныя ўмовы для некатолікаў.

Становішча пратэстантаў у ВКЛ з другой паловы XVII ст. амаль да канца XVIII ст. мела сваю спецыфіку і адрозненне ад астатняй Рэчы Паспалітай. У 1696 г. у Літоўскай кальвінісцкай правінцыі дзейнічаў 51 збор, у той час як у Вялікапольскай і Малапольскай правінцыях, узятых разам, – каля 22 збораў [7, с. 251]. Важную ролю адыгрываў і той факт, што на тэрыторыі Княства сетка каталіцкіх касцёлаў (асноўных прэтэндэнтаў на маёмасць, у тым ліку зямельныя ўладанні пратэстантаў, і на сферы іх уплыву) не была такой шчыльнай, як у Кароне [8, с. 60].

Істотнае значэнне для кальвіністаў Літоўскай евангелісцкай правінцыі мелі апошнія прадстаўнікі біржанскай галіны роду Радзівілаў. Магнаты фінансавалі будаўніцтва збораў, школ, шпіталяў у Слоніме, Слуцку, Кейданах [9, арк. 21]. Пасля смерці Януша і Багуслава Радзівілаў функцыі абаронцы пратэстантаў Літвы, Жмудзі, Белай Русі і Палесся (Слуцк, Копыль, Койданава, Навагрудак, Біржы, Заблудаў і інш.) перайшлі да дачкі Багуслава Караліны. Людвіка Караліна Радзівіл дапамагала наладжваць кантакты з уплывовымі ў ВКЛ і ў Рэчы Паспалітай асобамі пратэстанцкага веравызнання, з замежнымі прадстаўнікамі, фінансавала адкрыццё храмаў,

школ, шпіталяў. Пасля смерці Людвікі Караліны, апякунства гэтымі землямі ўзяў на сябе другі муж Радзівілавай нойбургскі князь Карл Філіп. Ён, ужо як рэйнскі электар (паўднёвы захад Германіі), падтрымліваў уладанні жонкі, якія атрымалі назву "нойбургскія землі" [10, с. 18].

Адной з вызначальных падзей у гісторыі рэлігійнага дысідэнцтва стала падпісанне ў 1660 г. Аліўскага міру, які прывёў да афармлення дысідэнцкага пытання як аб'екта міжнародных адносін. Заключаны паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй па выніках вайны 1655–1660 гг. гэты мір агаворваў прававы статус пратэстантаў Кароны і ВКЛ, а гарантам яго выканання абвяшчалася Прусія. Ратыфікацыя артыкулаў Аліўскай дамовы зафіксавала прававую, эканамічную і рэлігійную дыскрымінацыю пратэстантаў.

Этапнай падзеяй у жыцці пратэстантаў Літоўскай правінцыі стала Паўночная вайна. На гэты раз пратэстанты Кароны і Княства абаронцам іх правоў выступіў шведскі кароль Карл XII. Саюзная дамова, якую ён заключыў у 1704 г. са Станіславам Ляшчынскім, утрымлівала 18-ты артыкул, які гарантаваў пратэстантам свабоду богаслужэння. У 1705 г. Карл XII выдаў універсал "Слаўнейшай эліце Вялікага княства Літоўскага", у якім абяцаў задаволіць патрабаванні ўсіх канфесій узамен на дапамогу ў вайне. Але ваенныя падзеі толькі ўзмацнілі антышведскія і антыдысідэнцкія настроі ў грамадстве Рэчы Паспалітай [11, с. 106]. Тым не менш пратэстанты ВКЛ не трацілі спадзяванняў атрымаць у барацьбе за свае правы моцную падтрымку з-за мяжы. Літоўскі рэфармацыйны сінод, на якім актыўную пазіцыю займалі прадстаўнікі беларускай пратэстанцкай шляхты у 1705 г. скардзіўся на прыгнёт за веру і прасіў дапамогі ў прускага манарха Фрыдрыха I [12, с. 250]. Апошні бачыў перспектыву ў аднаўленні пастановы 1599 г., якая прадугледжвала сумесныя дзеянні праваслаўных і пратэстантаў супраць каталіцызму ў абодвух яго абрадах, рымскім і грэчаскім [5, с. 6].

Надзвычай востра пытанне аб правах дысідэнтаў паўстала на "нямым сойме" 1717 г., дзе канфлікт караля з канфедэратамі вырашаўся за пасрэдніцтвам расійскага цара. У праекце пагаднення караля са шляхтай, так званым Варшаўскім трактаце, змяшчаўся артыкул аб значным абмежаванні рэлігійнай свабоды праваслаўных і пратэстантаў [13, арк. 1 зв.].

Соймавая канстытуцыя 1717 г. уразіла пратэстантаў ВКЛ. Яны накіравалі да Пятра I просьбу аб дапамозе ўсім дысідэнтам Княства, да якіх, як спецыяльна падкрэслівалася ў тым прашэнні, належалі і прадстаўнікі грэчаскай веры. Евангеліцкае духавенства прапаноўвала расійскаму манарху запатрабаваць ад польскага караля і вялікага князя літоўскага Аўгуста II аднавіць усе адабраныя ў дысідэнтаў і неунітаў правы і прывілеі [14, арк. 1 зв.].

Заручыўшыся падтрымкай суседніх дзяржаў і мясцовай уплывовай шляхты, пратэстанты спадзяваліся выправіць сітуацыю на сойме 1718 г., які праходзіў у Гродна. Супраць іх выступіў дастаткова моцны каталіцкі блок. У інструкцыях на гэты сойм паслы, напрыклад з Полацка, прывезлі пажаданні канчаткова пазбавіць пратэстантаў і праваслаўных грамадзянскіх правоў [15, с. 364]. "Кожны тое бачыць і ведае, што ў дысідэнцкіх дзяржавах ніхто з

католікоў як на вышэйшыя, так і на ніжэйшыя ўрадавыя пасады не дапускаецца, так і ў нашай каталіцкай краіне, згодна з канстытуцыяй аб ерытыках... дысідэнтаў на ганаровыя пасады не дапускаць...", – гаварылася ў той інструкцыі [16, с. 332]. На сойме быў блакіраваны голас А. Пятроўскага – пасла-кальвініста з ВКЛ. Засталіся праігнараванымі выказванні яшчэ шасці пратэстантаў. Нягледзячы на падтрымку з боку прускага і англійскага рэзідэнтаў, забяспечыць сабе раўнапраўе пратэстантам на гэтым сойме не ўдалося. Прускі кароль Фрыдрых Вільгельм І прыняў гэты факт да ведама і перад наступным соймам 1720 г. асабіста звярнуўся да памочніка польскага караля Аўгуста ІІ, з патрабаваннем абвясціць раўнапраўе католікаў і пратэстантаў.

Кожная новая хваля каталіцкай рэакцыі, як правіла, актывізавала пратэстанцкія сілы. У 1720 г. прадстаўнікі Літоўскай кальвінісцкай правінцыі на афіцыйным узроўні звярнуліся да караля Аўгуста ІІ з петыцыяй, дзе агаворвалася своеасаблівасць канфесійнай сітуацыі ў Вялікім княстве Літоўскім і яе адрозненне ад Кароннай. Яны нагадвалі аб раўнапраўі ўсіх хрысціянскіх вер, якое забяспечваў Статут ВКЛ 1588 г., патрабавалі не парушаць закон і не руйнаваць прававы парадак Княства [17, арк. 18].

Прадставіць свае крыўды вальнаму сойму 1724 г. пратэстанты Літоўскай правінцыі дэлегіравалі навагрудскага падстолія Яна Ваўка Ланеўскага і гродненскага падчашага Яна Стрыенскага. Паслы прадставілі сойму дакумент з 49 параграфаў-патрабаванняў аб забеспячэнні прававой, эканамічнай і рэлігійнай роўнасці. "Забаранялася, – гаварыў гэты дакумент, – хаваць нябожчыкаў без дазволу мясцовага ксяндза, духавенства іх (кальвіністаў. – Н.П.) не можа з хаты галавы высунуць, бо трапіць на знявагу або нават на небяспеку для жыцця... школы зачыняюць і не дазваляюць трымаць хатніх настаўнікаў, каб дзеці ішлі да іх (каталіцкіх. – Н.П.) школ, а потым – да прыняцця каталіцызму; што нават на смертным ложы дысідэнтам спакою не даюць, з'яўляюцца езуіты, калі даведаюцца, што кальвініст або лютэранін памірае або цяжка хварэе, сілком даюць яму камунію і лічаць яго, такім чынам, за католіка...; нападаюць на бязвінных дысідэнтаў на дарогах і ў гарадах; не так даўно езуіты напалі на хату каменданта горада Слуцка, забралі адтуль двух дысідэнцкіх вучняў і завялі ў свой калегіум, там збілі..." [16, с. 356]. Але гэту петыцыю ўрад не ўдастоіў адказам.

Што тычыцца прававога становішча праваслаўных ВКЛ у вызначаны час, то іх абаронай, згодна з Андрусаўскім перамір'ем (1667 г) і "вечным мірам"(1686 г), павінен быў займацца Маскоўскі патрыярхат [18, с. 39]. Дзяржаўная палітыка Рэчы Паспалітай прывяла да істотнага звужэння сферы ўплыву праваслаўнай царквы на тэрыторыі Княства і Кароны. Каралеўскай граматай 1676 г. праваслаўнаму духавенству і свецкім людзям было забаронена ўступаць у кантакты з Канстанцінопалем і выязжаць з гэтай мэтай за мяжу. У 1682 г. пазбаўляліся грамадзянскіх і рэлігійных праву асобы, якія пераходзілі з уніі ў праваслаўе. Гэтыя пастановы выклікалі негатыўную рэакцыю ў праваслаўным свеце. У сваім лісце ў Слуцк віленскае

праваслаўнае брацтва асудзіла каралеўскія рашэнні, у якім убачыла наступ на правы духавенства і ганебнае стаўленне да праваслаўнай веры [19, с. 29].

Такім чынам, у апошняй трэці XVII ст. праваслаўнае духавенства і насельніцтва Беларусі апынулася не ў менш цяжкіх умовах, чым пратэстанты. Дзяржава вяла ўзмоцнены наступ на іх правы. Не на іх карысць складвалася і грамадская думка. На соймах і сойміках шляхта катэгарычна патрабавала абмежавання некатолікаў у правах [20, с. 102]. Канфесіныя непаразуменні разрастаючыся, выйшлі за межы царквы і ўжо выходзілі за межы дзяржавы.

Пасля падпарадкавання Кіеўскай мітраполіі маскоўскаму патрыярху і пераходу ўкраінскіх праваслаўных епархій – Львоўскай, Пярэмышльскай і Луцкай – на унію (канец XVII ст. – пачатак XVIII ст.) этнічныя беларускія землі засталіся адным з апошніх у Рэчы Паспалітай праваслаўным рэгіёнам. Тут знаходзіліся прыходы Беларускай епархіі з цэнтрам у Магілёве, а таксама буйныя манастыры і цэрквы Вільні, Беластока і іх ваколіц, Мінска, Слуцка, Пінска, Драгічына, Оршы, падначаленыя кіеўскаму мітрапаліту.

Абаронцай правоў праваслаўных у ВКЛ і Рэчы Паспалітай абвясціў сябе расійскі цар Пётр Вялікі (1687–1725). Былі ўпарадкаваны справы з прызначэннем кіраўніка на Магілёўскую епархію і пачалася актыўная дыпламатычная барацьба за правы праваслаўных Магілёўскай епархіі і іншых праваслаўных прыходаў. У 1700 г. Пётр I пачаў актыўную перапіску з Аўгустам II (нам вядомы лісты Пятра I 1700, 1703, 1712, 1718, 1722 і 1724 гг.) [21, с. 107–115], у якой раз за разам настойліва патрабаваў спыніць прыгнёт праваслаўных на беларускіх землях.

Выгнанне шведскіх войск з тэрыторыі Рэчы Паспалітай у час Паўночнай вайны дазволіла Пятру I актывізаваць палітыку вяртання былога правога статуса праваслаўных. Падчас прыбывання расійскіх войск у Магілёве ў 1707 г. з’явілася магчымасць вырашыць пытанне аб Беларускай епархіі. Цар уладкаваў на яе новаасвечанага епіскапа Сільвестра Чацвярцінскага (1707–1729). Пасвячэнне С. Чацвярцінскі атрымаў з рук тагачаснага кіеўскага мітрапаліта Варлаама Ясінскага (1690–1707) і набыў тытул “епіскапа ўсёй Белай Русі, мсціслаўскага, аршанскага, магілёўскага і намесніка мітрапаліта Вялікага княства Літоўскага”, а ў лютым 1710 г. цар выдаў загад накіраваць у Магілёў камісара стольніка Багуслава Якаўлевіча Шыпнеўскага для абароны аднаверных ад крыўд з боку католікаў і уніятаў, а таксама для нагляду за дзейнасцю беларускага епіскапа.

Дастаткова супярэчлівай падзеяй у канфісійным жыцці стаў “нямы сойм” 1717 г. У Рэчы Паспалітай з’явілася рэальная пагроза знішчэння некаталіцкіх веравызнанняў. Утвораная Тарнаградская канфедэрацыя ў IV артыкуле сваіх патрабаванняў змясціла план паступовага выцяснення дысідэнтаў і “дэзунітаў” з краіны. На “нямым сойме” 1717 г. было агучана, што “Рэч Паспалітая можа быць моцнай толькі тады, калі ў краіне будзе дамінаваць адно веравызнанне. З гэтай нагоды неабходна знішчыць не толькі дысідэнтаў, але і уніяцтва” [5, с. 19].

Рускі пасол Далгарукі даў сваю згоду на замацаванне канстытуцыяй сойма агучанай пастановы, атрымаўшы ўзамен абяцанне скараціць колькасць войска Кароны і ВКЛ. Паводле гэтай пастановы, рэлігійныя і грамадзянскія правы дысідэнтаў і праваслаўных у чарговы раз значна абмяжоўваліся. Беларускі даследчык А. Грыцкевіч убачыў у такіх дзеяннях расійскага манарха і яго дыпламата жаданне падтрымаць канфесійную напружанасць у Рэчы Паспалітай, каб карыстацца ёй у сваіх мэтах [1, с. 364].

Імкненні Пятра І выправіць канфесійную сітуацыю ў Магілёўскай епархіі назіраліся і пазней. Так, у 1718 г. ён накіраваў Аўгусту ІІ ліст з патрабаваннем спыніць знявагу праваслаўных і вярнуць ім адабраныя манастыры і цэрквы [22, с. 261]. У адказ Аўгуст ІІ выдаў 28 лістапада 1720 г. грамату ў абарону праваслаўных цэркваў і манастыроў Беларускай епархіі, хоць і пераконваў, што ганенняў на праваслаўных у ВКЛ не зафіксавана [23, с. 30]. У 1722 г. Пётр І звярнуўся да Аўгуста ІІ у пагрозлівай форме і прапанаваў стварыць камісію па разборы скаргаў іншаверцаў, а таксама накіраваць у Магілёў камісараў ад кожнага з бакоў для вывучэння рэальнага прававога статуса канфесіі.

Каб узмацніць эфектыўнасць сваёй веразаступніцкай палітыкі і прыцягнуць увагу ўсяго свету да праблемы праваслаўных Пётр І у 1722 г. паслаў у Рым ліст, у якім звяртаў увагу папы на ганенні праваслаўных у Беларускай епархіі. У 1724 г. расійскі імператар звярнуўся да Аўгуста ў чарговы раз і атрымаў адказ, што ніякіх ганенняў дысідэнтам і "дэзунітам" у яго дзяржаве не чыняць, што ў свеце няма дзяржавы больш талерантнай, чым Рэч Паспалітая [24, с. 65], а калі выпадкі парушэння закона маюць месца, то пакрыўджаныя павінны звяртацца да айчынных органаў улады і судоў.

Смерць Пятра І у 1725 г. пазбавіла беларускіх праваслаўных замежнага заступніка і пытанне аб спыненні прававых абмежаванняў у грамадскай, эканамічнай, асветніцкай і рэлігійнай дзейнасці страціла сваю акутальнасць. Са знешнеаплітычнай сферы яно перайшло ў разрад ўнутранных грамадска-палітычных праблем ВКЛ і Рэчы Псапалітай.

Падсумоўваючы вышэйпрыведзены матэрыял адзначым, што на працягу другой паловы XVII – першай чвэрці XVIII ст. правы пратэстанцкага насельніцтва на беларускіх землях ВКЛ былі істотна абмежаваны ў параўнанні з папярэднім стагоддзем. Гэтаму садзейнічалі ваенныя падзеі (казацка-сялянская, шведска-польская, руска-польская войны сярэдзіны XVII ст., а таксама Паўночная вайна) разам з дзяржаўнай дыскрымінацыйнай палітыкай (антыдысідэнцкія соймавыя канстытуцыі 1658, 1668, 1673 і 1717 гг.) і з пракаталіцкімі настроямі ў грамадстве. На землях Беларусі назіралася зніжэнне колькасці пратэстантаў, закрыццё храмаў, адукацыйна-асветніцкіх і дабрачынных устаноў. Разам з істотным абмежаваннем рэлігійна-місіянерскай дзейнасці духавенства назіралася пагаршэнне грамадскага і прававога становішча пратэстанцкай шляхты і дзяржаўных дзеячоў.

Праваслаўныя вернікі Магілёўскай епархіі, так сама як і пратэстанты Літоўскай правінцыі ў вызначаны перыяд адчулі на сабе ўзмацненне ціску. Магілёўскай кафедра засталася апошняй правасаўнай у Рэчы Паспалітай,

праваслаўная шляхта і брацтвы слабелі і знікалі, праваслаўнае духавенства вылучалася нізкім узроўнем святарскай падрыхтоўкі і непісменасцю, манастыры і цэрквы знаходзіліся ў занядбаным стане. Ускладняла сітуацыю дзяржаўная канфесійная палітыка, якая не прадугледжвала падтрымкі праваслаўных асяродкаў. Гэтыя абставіны разам з шэрагам іншых былі выкарыстаны ўсходняй суседкай для лабіравання сваіх інтарэсаў у Рэчы Паспалітай. Але сапраўднай дапамогі беларускія праваслаўныя ў барацьбе за свае правы так і не атрымалі.

**Літаратура:**


1. Грыцкевіч А.П. Дзейнасць Віленскага сінода рэфармацкіх абшчынаў у ВКЛ // Беларусіка "440 год рэфармацыі ў Беларусі": Матэрыялы міжнар. навук. канф. – Мн.: Навука і тэхніка, 1995. – Вып. 4 – С. 357–366.
2. Augustyniak U. Testamenty ewangelików reformowanych w WKL. – Warszawa: Semper, 1992. – 249 s.
3 Wojak T. Szkice z dziejów reformacji w Polsce XVI i XVII w. – Warszawa: Wyd. Zwiastun, 1977. – 180 s.
4. Tworek S. Materiały do dziejów kalwinizmu w Wielkim Księstwie Litewskim w XVII w. // Odrodzenie i reformacja w Polsce. – 1969. – T. XIV. – S. 199 – 215.
5. Kosman M. Litewska jednota ewangelicko-reformowana od połowy XVII do 1939 r. – Opole: Zakład Poligrafichny Wyższej Szkoły Pedagogicznej, 1986. – 146 s.
6. Rachuba A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569–1763. – Warszawa: Wyd. Sejmowe, 2002. – 373 s.
7. Kosman M. Reformacja i kontrreformacja w Wielkim księnstwie Litewskim w świetle propagandy wyznaniowej. – Wrocław, Warszawa, Kraków, Gdańsk: Wyd. Polskiej Akademii Nauk, 1973. – 273 s.
8. Litak S. Parafie w Rzeczypospolitej w XVI–XVIII wieku. Struktura, funkcje społeczno-relegijne i edukacyjne. – Lublin: wyd. KUL, 2004. – 515 s.
9. Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве (AGAD), Архіў Радзівілаў, Фонд VIII, Акты, якія тычацца духавенства, Спр. 710.
10. Мацук А.У. Радзівілы і справа аб "нойбургскіх уладаннях" (1730–1740-я гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. Сер. гуманітар. навук.–2005. – № 3. – С. 15–21.
11. Катлярчук А. Шведы ў гісторыі і культуры беларусаў. – Мн.: Энцыклапедыкс, 2002. – 272 с.
12. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. – Вильня: Изд. О.В. Щербицкого, 1870. – Т. 8. – 468 с.
13 Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў у Маскве (РДАСА). Фонд 12, Справы аб Польшчы і Літве, Воп. 1., Спр. 55.
14 Фонд 79, Адносіны Расіі з Польшчай, . Воп. 5., Спр. 28.
15 Белоруссия в эпоху феодализма: Сб. док. и материалов: В 3 т.–Мн.: Изд. Академии наук, 1960. – Т. 2. – 559 с.

16. Łukaszewicz J. Dzieje kościołów wyznania helweckiego w Litwe. – Poznań: Druk. Orędownika na Garbarach, 1842. – T.1–2. – 414 s.
17. Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве (AGAD), Архіў Радзівілаў, Фонд VIII, Акты, якія тычацца духавенства, Спр. 710.
18. Белорусский архив древних грамот. – М.: Тип. С. Селивановского, 1824.– Ч. 1. – 148 с.
19. Архив Юго-Западной России, издаваемый Временной комиссиею для разбора древних актов. 1648–1798. – Киев: Университетская тип., 1871. – Т. 4, Ч. 1. – 744 с.
20. Стороженко Н.В. Западно-русские провинциальные сеймики во II половине XVII в. – Киев: Тип. К.Н. Милевского, 1888. – 140 с.
21. Сборник документов, уясняющих отношения латино-польской пропаганды к русской вере и народности. – Вильня: Тип. Вилен. губ. прав., 1866.– Вып. 2.–272 с.
22. Уния в документах / сост. В.А. Теплова, З.И. Зуева.–Мн.: Лучи Софии, 1997. – 520 с.
23. Историко-юридические материалы, извлечённые из Актовых книг губерний Витебской и Могилёвской. – Витебск: Тип. губерн., 1901. – Вып. 29. – 472 с.
24. Kasprowicz J. Moskwa wobec Unii i Polski. Wyd. III. – Kraków: Wyd. groszowe im. T. Kaściuszki, 1910. – 80 s.